ЗАЎТРА ДЗЕНЬ МЕДЫЦЫНСКАГА РАБОТНІКА

# ВАРТАВЫМ ЗДАРОЎЯ НАША ПРЫВІТАННЕ!

## КАБ ЛЮДЗІ БЫЛІ ЗДАРОВЫМІ

18 чэрвеня савецкія людзі другі раз адзначаюць Дзень медыцынскага работніка. Вартавымі здароўя называюць медыкаў працоўныя. І гэта вельмі прыемна чуць нам, медыкам. Разам з тым мы адчуваем вялікую адказнасць, якую павінны несці перад народам,адказнасць за кожнае жыццё.

Свята гэтага года надзвычай прыемнае для нас: яно адзначаецца ў юбілейным,пяцідзесятым годзе Савецкай улады.За гады Савецкай улады ў нашай краіне створана самая прагрэсіўная ў свеце сістэма службы здароўя. Галоўныя яе прынцыпы — бясплатнае лячэнне, шырокая даступнасць урачэбнай дапамогі для працоўных і прафілактычная накіраванасць. Усе гэтыя дасягненні савецкай медыцыны, якімі мы можам ганарыцца, сталі магчымымі дзякуючы Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, пастаянным клопатам партыі і ўрада аб дабрабыце народа, яго здароўі.

Устанаўленне свята медыцынскага работніка з'явілася прызнаннем тых заслуг перад народам, якія ажыццявілі і штодзённа ажыццяўляюць людзі самай гуманнай прафесіі на зямлі —медыкі. Поспехі нашай медыцыны бясспрэчныя. Яркім пацвярджэннем гэтага могуць служыць тыя пераўтварэнні,якія адбыліся за гады Савецкай улады на тэрыторыі нашага раёна. Замест 5 бальнічных ложкаў да рэвалюцыі, у раёне налічваецца ў гэтым годзе 940 ложкаў, працуюць тры буйныя раённыя і гарадская бальніцы, 6 участковых, 2 туберкулёзныя бальніцы, 27 фельчарска - акушэрскіх пунктаў і 10 здраўпунктаў, 4 паліклінікі, 6 жаночых і дзіцячых кансультацый, 2 санітарныя станцыі, 12 дзіцячых дашкольных устаноў, школа-інтэрнат. Замест аднаго ўрача і 3 фельчараў —153 урачы (не лічачы зубных) і 665 работнікаў сярэдняга медыцынскага персаналу. Толькі за мінулы год раён папоўніўся 33 урачамі і 109 фельчарамі і медыцынскімі сёстрамі.

У раённай бальніцы аказваюцца ўсе віды спецыяльнай медыцынскай дапамогі, шырока прымяняюцца найноўшыя метады дыягностыкі і лячэння хворых. Праводзяцца хірургічныя аперацыі на органах брушной і грудной поласцей, на касцях, аперацыі вачэй і вуха, атрымала развіццё анестэзіялогія і фізіятэрапія.

Прыкметна павысілася майстэрства і кваліфікацыя нашых урачоў і сярэдніх медработнікаў, культура медыцынскага абслугоўвання, скарочана розніца паміж узроўнем медабслугоўвання ў горадзе і вёсцы. Людзі з падзякай і цеплынёй адклікаюцца аб медыках, вярнуўшых ім здароўе і радасць жыцця, такіх, як Д. І. Міцура, М. Г. Карачан, Д. А. Нянашаў, Л. Е.Судзілоўская, А. І. Саланові́ч, Т. А. Козак, С. І. Падаляк, П .А. Гецман, Т. А. Гарамыкіна і іншых.

Сустракаючы сваё свята, нашы медыкі ўсведамляюць, што не ўсё яшчэ зроблена для працоўных. У нас ёсць цэлы шэраг нявырашаных пытанняў і нямала недахопаў. Перад намі стаяць вялікія задачы па павышэнню культуры медыцынскага абслугоўвання, зніжэнню захворванняў і смяротнасці,паляпшэнню прафілактыкі захворванняў, а таксама пашырэнню санітарна-гігіенічных ведаў сярод насельніцтва.

М. СЕЎРУК,
намеснік галоўнага ўрача раёна па лячэбнай частцы.

*МЕДСЕСТРЕ*

*Таблеткой и шуткой поможет,*
*А если не кончится боль,*
*На лоб раскалённый положит*
*Защиту от бреда — ладонь.*

*АКУШЕРКЕ*

*И нет профессии человечнее*
*На всех шести материках,*
*Когда лежит все человечество*
*У акушерки на руках.*